В.Ф. Падстаўленка

# IV Міжнародныя навуковыя чытанні «Ян Баршчэўскі ў славянскім свеце»

## (да 210-годдзя з дня нараджэння)

Плённае развіццё добрых традыцый, безумоўна, з'яўляецца пазітыўным фактам у нашым супярэчліва-дынамічным жыцці. Яскравым прыкладам гэтай думкі могуць выступіць рэгулярныя Міжнародныя канферэнцыі, прысвечаныя творчасці Яна Баршчэўскага.

Прыемна адзначыць, што 18 мая 2004 г. адбыліся ўжо чацвёртыя чытанні «Ян Баршчэўскі ў славянскім свеце», прымеркаваныя да 210-х угодкаў з дня нараджэння аднаго з самых адметных польска-беларускіх творцаў першай паловы XIX стагоддзя.

Нагадаем, што ўпершыню літаратурна-краязнаўчая канферэнцыя па творчасці гэтага пісьменніка прайшла ў лістападзе 1996 г. у в. Гарбачэва Расонскага раёна. Праз некаторы час (у лістападзе 1998 г.) прыхільнікі таленту Яна Баршчэўскага сабраліся ў Полацку. І вось ужо двойчы (у снежні 2000 г. і селета) вучоных-баршчэўсказнаўцаў гасцінна прымаў Віцебск. Традыцыйна арганізатарамі Міжнародных чытанняў выступілі УА «ВДУ імя П.М. Машэрава» і Польскі інстытут у Мінску. Дарэчы, дырэктар апошняй з пералічаных устаноў – Цэзарый Карпіньскі ўдзельнічаў у працы канферэнцыі.

Жаданне выступіць на IV Міжнародных навуковых чытаннях «Ян Баршчэўскі ў славянскім свеце» выказалі вучоныя Мінска, Варшавы, Брэста, Гомеля, Магілёва, Полацка.

На адкрыцці канферэнцыі з прывітальным словам да прысутных звярнуўся рэктар УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», прафесар А.У. Русецкі. На пленарным пасяджэнні былі заслуханы даклады і паведамленні аўтарытэтных вучоных – літаратуразнаўцаў і вядомых дзеячаў культуры: дырэктара Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАН Рэспублікі Беларусь, акадэміка У.В. Гніламёдава («Беларуская кампаратывістыка на сучасным этапе развіцця айчыннага літаратуразнаўства»), загадчыка кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, прафесара А. Баршчэўскага («Суіснаванне фантастычнага і рэалістычнага ў мастацкай прозе Яна Баршчэўскага»), загадчыка кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ, дацэнта М.В. Хаўстовіча («Мастацкі метад Яна Баршчэўскага і развіццё літаратуры 30–40-х гадоў XIX стагоддзя»), загадчыка кафедры біялогіі ВДУ імя П.М. Машэрава, прафесара А.М. Дарафеева («Ян Баршчэўскі: погляд у будучыню»), члена Саюза пісьменнікаў Беларусі С.С. Панізніка («Міфалогія і літаратура: паэтычнае прачытанне праблемы»).

Далейшая праца IV Міжнародных чытанняў адбывалася ў дзвюх секцыях: літаратуразнаўчай і культуралагічна-лінгвістычнай. Былі прадстаўлены індывідуальныя навуковыя даследаванні гасцей канферэнцыі, выкладчыкаў нашага універсітэта і (што таксама важна падкрэсліць!) студэнтаў. Актыўны ўдзел у працы чытанняў прынялі выкладчыкі і аспіранты кафедры беларускай літаратуры УА «ВДУ імя П.М. Машэрава» (імі было падрыхтавана 11 дакладаў).

У якасці культурнай праграмы ўдзельнікі канферэнцыі змаглі наведаць сядзібу І. Рэпіна ў Здраўнёва. Тут іх чакала вялікая пазнавальная экскурсія, прысвечаная жыццю і творчасці славутага рускага мастака.

Праведзеныя IV Міжнародныя навуковыя чытанні «Ян Баршчэўскі ў славянскім свеце» адлюстроўваюць не толькі значную цікавасць даследчыкаў да асобы гэтага творцы, сведчаць пра актуальнасць яго пісьменніцкай спадчыны ў сучасным літаратурным працэсе, але і выяўляюць перспектыўнасць новых навуковых пошукаў у гэтым напрамку.